данне зместу псіхалогіі па існуючых да цяперашняга часу падручніках. У іх выкладаюцца і раскрываюцца разнастайныя паняцці: асоба, дзейнасць, зносіны, успрыманне, памяць, мысленне, воля, эмоцыі, характар, тэмперамент, здольнасці. Цэласная асоба ў такім веданні разабрана на часткі, і зразумець яе функцыянаванне ў розных формах дзейнасці і сістэмна на практыцы не ўяўляецца магчымым. Прафесійны напрамак вучэбнага матэрыялу ў адпаведнасці з асаблівасцямі мастацка-творчай дзейнасці высочваецца вельмі слаба. Пераліку розных псіхічных з'яў, ведання іх азначэнняў і некаторых заканамернасцей яўна недастаткова для разумення спецыялістам рэальнай карысці такіх ведаў для практычнай дзейнасці.

Прапануем напрамкі пераадолення вышэй выказаных недахопаў у псіхолага-педагагічнай падрыхтоўцы работнікаў культуры і мастацтва.

1. Перш за ўсё ў змесце базавых псіхолага-педагагічных ведаў неабходна шырока адлюстраваць профільныя віды канкрэтнай дзейнасці, пастаянна рэалізоўваць прынцыпы адзінства тэорыі і практыкі, раскрываючы пры гэтым механізмы, заканамернасці спецыяльных відаў культурна-мастацкай дзейнасці: харэаграфічнай, музычнай, акцёрскай, вакальнай, арганізацыйна-метадычнай, бібліятэчнай. У метадычным плане мэтазгодна ў працэсе вывучэння дысцыплін актыўна і сістэматычна ажыццяўляць сінтэз фундаментальных уласна псіхалагічных ведаў са спецыяльнамастацкімі. Відавочна, што акцэнты на раскрыццё механізмаў, асаблівасцей развіцця, напрыклад музычнай, эмацыянальнай памяці, заканамернасцей успрымання і разумення музыкі, карціны, тэксту; праяўленне ўвагі, эмоцый, волі ў мастацкай дзейнасці; раскрыццё ўплыву розных відаў мастацтва на развіццё сацыяльна важных якасцей асобы -- асноўныя дыдактычныя ўмовы, якія фарміруюць свядомае прафесійна накіраванае засваенне ведаў. Адначасова ў такіх вучэбных сітуацыях усведамляецца не толькі практычная каштоўнасць псіхалагічных ведаў, але паступова складваецца гатоўнасць выкарыстоўваць іх у працэсе кіравання калектывам, карэкцыі, самарэгуляцыі сваіх паводзін у сумеснай з ім дзейнасці.

2. Вывучэнне з мэтай шырокага ўкаранення ў практыку адэкватных працаёмкіх дыягнастычных методык, з дапамогай якіх ацэньваюцца ўзроўні развіцця пэўных якасцей чалавека, яго асобных і спецыяльных здольнасцей, а таксама дасягненні навучэнцаў у розных відах мастацкай дзейнасці.

3. Праблемнае вывучэнне матэрыялу, выкарыстанне імітацыйных псіхолага-педагагічных гульняў, дыскусій, стварэнне на матэрыяле прадмета іерархічнай сістэмы практычных вучэбных задач.

4. Асаблівае месца ў сістэме псіхалагічнай падрыхтоўкі студэнтаў павінна займаць праблематыка, якая раскрывае развіццёвыя функцыі розных відаў мастацка-творчай дзейнасці і тэхнікі гульні ў працэсе ўключэння ў іх дзяцей рознага ўзросту, а таксама магчымасці іх у карэкцыі паводзін і сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі асобы.

5. Сацыяльна-псіхалагічная падрыхтоўка студэнтаў у вырашэнні будучых прафесійна-практычных задач дапускае лагічны пераход ад фарміравання ўзроўню ведаў да актыўнага развіцця з дапамогай разнастайных трэнінгаў спецыяльных, вербальных і невербальных камунікатыўных уменняў і навыкаў.

6. Найбольш інтэгральна з выяўленым прафесійным накірункам псіхолага-педагагічны цыкл дысцыплін магчыма рэалізаваць на курсах па прафесійным майстэрстве ў канкрэтных відах дзейнасці.

Грачова В.А.,
ст.выкладчык

## ПРЫЁМ ВЫКАРЫСТАННЯ МАСТАЦКАЙ ІНФАРМАЦЫІ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ ПЕДАГОГІКІ

У сучасны момант, калі так няшмат засталося ўстойлівых ісцін, асабліва ў галіне грамадскіх навук, хочацца абаперціся на нешта ўстойлівае і па магчымасці прыгожае. Зыходзячы з гэтай простай патрэбы, мы вырашылі значна пашырыць у курсе агульнай педагогікі раздзел "Гісторыя педагогікі", разглядаючы яго пытанні ў кантэксце гісторыі сусветнай мастацкай культуры. Гэты падыход знайшоў водгук як у студэнтаў-культуролагаў, так і ў калег-выкладчыкаў. Зразумела, што выкладанне гэтага матэрыялу патрабуе ілюстравання такімі мастацкімі творамі, якія, з аднаго боку, будуць уключаць помнікі, ужо добра знаёмыя студэнтам, "хрэстаматыйныя", з другога - пашыраць іх веды не толькі па



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагогікі, але і па гісторыі мастацтва, фарміраваць уяўленні аб важнейшых тэндэнцыях у існаванні зямных цывілізацый.

Трохгадовы вопыт выкладання гісторыі педагогікі ў кантэксце гісторыі сусветнай мастацкай культуры дазволіў скласці асноўны алгарытм размеркавання вучэбнага матэрыялу і вызначыць шэраг дзейсных прыёмаў яго выкарыстання.

Перш-наперш высветлілася, што амаль усе студэнты маюць вельмі цьмяныя ўяўленні аб агульнакультурных тэндэнцыях сусветнай гісторыі, яе перыядызацыі і месцы той ці іншай эпохі ў агульным струмені часу. Давялося пачынаць кожную лекцыю з разглядання ўмоўнай "лініі часу" і высвятлення месца, якое займае на ёй разглядаемая эпоха (напрыклад, сярэднявечча ў Заходняй Еўропе і на Русі, эпоха Асветніцтва і г.д.).

Наступнае пытанне - сацыяльныя і прыродна-геаграфічныя ўмовы існавання грамадства, якія вызначаюць спосаб жыцця сям'і і асобы. Тут вельмі карыснымі з'яўляюцца творы літаратуры і выяўленчага мастацтва, якія адлюстроўваюць быт і звычаі вывучаемай эпохі. Гэта могуць быць як творы сучаснікаў, так і пазнейшыя рэканструкцыі. Напрыклад, жыццё першабытнага чалавека знайшло адлюстраванне ў палотнах шэрагу мастакоў XX ст.; абрад пасвячэння ў дарослых апісаны ў навукова-папулярных кнігах для падлеткаў. У прыватнасці, аб тым, як гэта магло адбывацца на тэрыторыі Беларусі, піша сучасны археолаг М.Чарняўскі ў кнізе "Вогнепаклоннікі".

Трэці блок інфармацыі тычыцца ўзроўню развіцця навукі і тэхнікі ў пэўную эпоху, напрыклад асаблівасцей пісьма (піктаграмы, іерогліфы, клінапіс), уяўленняў аб будове сусвету і г.д. Зараз для асвятлення гэтых пытанняў часцей за ўсё даводзіцца карыстацца кніжнай ілюстрацыяй, але ў далейшым хацелася б мець кіна-і відэафрагменты.

Чацвёрты блок - вядучыя тэндэнцыі ў працэсе развіцця мастацтва вывучаемай эпохі. Візуальныя і аўдыёілюстрацыі падбіраюцца з ліку найбольш знаёмых, тых, што пазнаюцца "з першага погляду" і першых гукаў.

Наступная інфармацыя паказвае адносіны грамадства да феномена дзяцінства: узроставая перыядызацыя, дзіцячыя вобразы ў мастацтве, з'явы матэрыяльнай і мастацкай культуры і ўвогуле дасягненні цывілізацыі, адрасаваныя дзецям. Пошук ілюстрацый да гэтага блока з'яўляецца найбольш складаным, але і найбольш прадуктыўным этапам падрыхтоўкі лекцыі. Вялікую цікавасць да такіх матэрыялаў праяўляюць студэнты. Некаторыя з іх выбіраюць адпаведныя тэмы курсавых работ па педагогіцы. Так, паспяхова былі абаронены работы на тэмах "Дзіцячыя вобразы ў мастацтве заходнееўрапейскага сярэднявечча", "Вобразы дзяцінства ў выяўленчым мастацтве італьянскага Адраджэння", "Творы заходнееўрапейскіх кампазітараў другой паловы XIX ст., адрасаваныя дзецям-слухачам і дзецям-выканаўцам". Значная частка сабраных студэнтамі матэрыялаў выкарыстоўваецца ў лекцыях.

Шосты блок адлюстроўвае характар мэт выхавання, пануючых у кожную гістарычную эпоху ў грамадстве. Вельмі выразным з'яўляецца тут спалучэнне візуальнай і тэкставай інфармацыі. І тая, і другая павінны быць сапраўднымі "дакументамі эпохі". Напрыклад, "Павучэнне пісца Хеці свайму сыну" асабліва выразна гучыць на фоне роспісаў і рэльефаў са старажытнаегіпецкіх пірамід, а "Павучэнне Уладзіміра Манамаха" - у спалучэнні з малюнкамі са старажытнаславянскіх летапісаў.

Апошні блок пытанняў - персаналіі знакамітых педагогаў эпохі. На жаль, няшмат партрэтаў гэтых дзеячаў па ўзроўню выканання могуць лічыцца высокамастацкімі, але іх творы, жыццё, ідэі натхнілі мастакоў-ілюстратараў на стварэнне маляўнічых выданняў, а таксама з'явіліся падставай да шэрагу экранізацый. Такім чынам, апошні блок інфармацыі можа быць ілюстраваны як аўтарскімі і прыжыццёвымі выданнямі (Скарына, Каменскі), так і больш позняй кніжнай графікай і фільмаграфіяй.

Выкладанне гісторыі педагогікі ў адпаведнасці з апісаным алгарытмам спалучае вобразную і інтэлектуальную, візуальную і слыхавую інфармацыю і, на наш погляд, у найбольшай ступені адпавядае псіхалагічным асаблівасцям студэнтаў-культуролагаў.

Аманькоў А.А.,
канд.псіхал.навук,
дацэнт

## АБ РАЗВІЦЦІ ПСІХАЛАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ЧАЛАВЕКА

Паняцце развіцця любога псіхалагічнага феномена патрабуе выдзялення яго асноўных структурных і зместавых характарыстык, якія і выступаюць крытэрыямі развіцця. Так, каб раз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ